■ Спорт-тайм

# БАТЭ — ЧАТЫРНАЦЦАЦІРАЗОВЫ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра чэмпіянат краіны па футболе, які завяршыўся на выхадных, пра выступленні беларускіх гандбольных клубаў у еўрапейскіх топ-турнірах і пра старт біятлоннага сезона.**

***1. Футбалісты БАТЭ 14-ы раз сталі чэмпіёнамі Беларусі.*** Свой 12-ы запар чэмпіёнскі тытул яны здабылі ў заключным, 30-м, туры чэмпіянату. Матч падапечных Аляксандра Ермаковіча супраць футбалістаў «Гарадзеі» скончыўся з лікам 3:3. Патрэбнага для перамогі выніку гульцы БАТЭ дабіліся толькі ў самай канцоўцы сустрэчы — на 78-й хвіліне Віталь Радзівонаў рэалізаваў пенальці, а на 5-й кампенсаванай хвіліне другога тайма Мірка Іваніч зраўняў лік.

Уладальнікамі сярэбраных медалёў сталі футбалісты мінскага «Дынама», якія на выездзе разграмілі «Віцебск» — 4:1. Сталічныя дынамаўцы і БАТЭ набралі па 68 ачкоў, але барысаўская дружына заняла першае месца дзякуючы дзвюм перамогам у вочных паядынках з мінчанамі.

Салігорскі «Шахцёр», які лідзіраваў на працягу большай часткі турніру, фінішаваў з «бронзай», саступіўшы ў апошнім матчы «Нёману» — 1:3.

Адзначым, што разам з наваполацкім «Нафтанам» найвышэйшую лігу пакідае мазырская «Славія», замест іх у найвышэйшай лізе выступяць дзве найлепшыя каманды першай лігі — мінскі «Прамень» і «Смалявічы-СТІ».

Найлепшым бамбардзірам нацыянальнага першынства стаў форвард БАТЭ Міхаіл Гардзяйчук, які забіў 18 мячоў.



***2. Адбыліся першыя гонкі біятлоннага сезона 2017/2018.*** Беларускія біятланісты фінішавалі 11-мі ў змяшанай эстафеце на першым этапе Кубка свету ў шведскім Эстэрсундзе. Надзея Скардзіна і Дар'я Домрачава правялі пачатак гонкі на высокім узроўні. Дар'я перадала эстафету Сяргею Бачарнікаву на шостым месцы. Аднак яму было складана ўтрымацца па хуткасці з лідарамі сусветнага біятлона. Акрамя таго, Сяргей атрымаў штрафны круг пры стральбе стоячы. Уладзімір Чапелін, які завяршаў гонку, таксама атрымаў адзін штрафны круг.

***3. Арына Сабаленка стала пераможцам турніру ў індыйскім Мумбаі з прызавым фондам $115 тыс.***



У фінальным паядынку яна сустракалася са славенскай тэнісісткай Далілай Якупавіч і перамагла ў двух сэтах — 6:2, 6:3.

У абноўленым рэйтынгу ВТА Арына займае 76-ю пазіцыю і з'яўляецца першай ракеткай краіны.

***4. Мінская «Сталіца» не прайшла ў «Фінал чатырох» розыгрышу Кубка УЕФА па міні-футболе.*** У венгерскім Д'еры чэмпіёны Беларусі ў стартавым матчы групы С абыгралі венгерскі клуб «Раба ЭТА» — 3:2, у другі гульнявы дзень саступілі італьянскаму «Лупарэнсэ» 4:8, а ў заключным матчы прайгралі ўкраінскаму клубу «Прадэксім» з Херсона — 3:7. Пуцёўку ў вырашальны этап турніру (які пройдзе ў красавіку 2018 года) заваявалі венгры.

***5. Гандбалісты мінскага СКА выйшлі ў групавы этап другога па рангу кантынентальнага турніру — Кубка ЕГФ.*** Па суме двух матчаў армейцы адолелі іспанскі «Лагранья». У першай гульні на пляцоўцы мінскага Палаца спорту «Уручча» армейцы выйгралі з перавагай у 8 мячоў — 36:28, а ў гасцявой сустрэчы саступілі «мінус 5» — 30:35 — і прайшлі далей. Жараб'ёўка групавога этапу Кубка ЕГФ адбудзецца 2 снежня.

Гандбалісты «Гомеля» завяршылі выступленне ў Кубку выкліку, двойчы прайграўшы ісландскаму клубу «Вестаманаэяр». Дома гамяльчане саступілі з лікам 27:31, у гасцях — 27:32.

Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова пацярпеў чацвёртае паражэнне запар у групе В Лігі чэмпіёнаў, разгромна прайграўшы на выездзе нямецкаму «Кілю» з лікам 23:32.

***6. Мінск прыме каманды чэмпіянат свету па спартыўнай хадзе ў 2020 годзе.*** Такое рашэнне прынята на пасяджэнні Савета Міжнароднай асацыяцыі лёгкаатлетычных федэрацый у Манака.

Сусветны форум сярод найлепшых хадакоў праводзіцца раз на два гады: у 2016-м яго прымаў Рым, у 2018-м спаборніцтвы адбудуцца ў кітайскім Тайчане.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| **Мінск —** | **9.00** | **16.54** | **7.54** |
| **Віцебск —** | **8.56** | **16.37** | **7.41** |
| **Магілёў —** | **8.50** | **16.44** | **7.54** |
| **Гомель —** | **8.39** | **16.49** | **8.10** |
| **Гродна —** | **9.14** | **17.11** | **7.57** |
| **Брэст —** | **9.07** | **17.19** | **8.12** |

## Месяц

*Першая квадра 26 лістапада.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

## Імяніны

*Пр. Дзмітрыя, Мікалая, Мікіты, Пятра, Рыгора.*
*К. Здзіслава, Рыгора, Сцяпана, Якуба.*



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

# ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

**28 ЛІСТАПАДА**

**1572** год — пачала сваю дзейнасць Лоская друкарня. Дзейнічала ў мястэчку Лоск (цяпер у Валожынскім раёне) і была цэнтрам рэфармацыйнага кнігадрукавання. Заснавана магнатам Я. Кішкам, які выкупіў у братоў М. і Г. Кавячынскіх абсталяванне Нясвіжскай друкарні і змясціў яго ў сваім замку ў Лоску. Ідэйным кіраўніком друкарні быў С. Будны. У ёй таксама ў розныя гады працавалі друкары Д. Ланчыцкі, Я. Карцан, Ф. Балямоўскі. Вядома каля 20 кніг, выпушчаных на польскай і лацінскай мовах, у тым ліку «Новы Запавет», «Пра дзве сутнасці Хрыста», «Пра свецкую ўладу» і іншыя. Друкарня перастала існаваць пасля смерці Кішкі ў 1592 годзе.

**1748** год — граматай караля Аўгуста III члену Мінскага магістрата Яну Давіду Шэйбу дазволена адкрыць аптэку агульнага карыстання — «для поратованья здоровья людей духовного, светского сану, в том городе живущих, так и для всего воеводства Минского». Каралеўскі герб над ёй быў усталяваны ў знак манапольнага права на продаж медыкаментаў. Аптэка была вельмі патрэбна гораду, але галоўнай прычынай было тое, што ў Мінску праходзілі пасяджэнні Галоўнага трыбунала Вялікага Княства Літоўскага. У горад прыязджалі кароль і дэпутаты з усяго княства, і ў выпадку хваробы такіх высокапастаўленых асоб звярнуцца па лекі не было куды. Аптэкару, а гэта быў член Мінскага магістрата Ян Давід Шэйба, былі дадзены вялікія льготы, ён цалкам вызваляўся ад нясення гарадскіх павіннасцяў. Іншым жа асобам ствараць аптэкі не дазвалялася. Аптэка Шэйбы 34 гады была адзіная ў горадзе. І толькі ў 1782 годзе быў дадзены дазвол на адкрыццё ў Мінску яшчэ адной аптэкі.

**1918** год — была створана Мінская ваенная акруга (2 кастрычніка 1926 г. пераўтворана ў Беларускую ваенную акругу). У 1992 годзе скасавана ў сувязі са стварэннем Міністэрства абароны і будаўніцтвам Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.



**1932** год — нарадзіўся Зіновій Майсеевіч Высакоўскі (1932—2009), савецкі артыст тэатра і кіно, народны артыст Расійскай Федэрацыі. Здымаўся ў фільмах «Яшчэ раз пра каханне», «Жывыя і мёртвыя», «Парк савецкага перыяду» і іншых. Выканаўца ролі пана Зюзі ў тэлевізійнай праграме «Кабачок «13 крэслаў».

**1943** год — пачалася Тэгеранская канферэнцыя кіраўнікоў трох саюзных дзяржаў у Другой сусветнай вайне — СССР (І. Сталін), ЗША (Ф. Рузвельт) і Вялікабрытаніі (У. Чэрчыль). Была прынята Дэкларацыя аб сумесных дзеяннях у вайне супраць Германіі і пасляваенным супрацоўніцтве, рашэнне аб адкрыцці другога фронту ў Еўропе, аб пасляваенных межах Польшчы і іншыя пытанні.

## Было сказана

**Міхась РУДКОЎСКІ, паэт, перакладчык, публіцыст:**
*«Без мазаля чалавека спрадвеку*
*Не лічаць у нас, не завуць чалавекам».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Існуе легенда, што камусьці патрэбны твой дыплом.**

— Фімачка, у нас ёсць грошы?
— Няма.
— Але як жа так?! Я ж табе ўчора зарплату аддаў?
— У мяне ёсць грошы. У нас — няма.

**А я веру ў прыкметы. Вось вараныя ракі — гарантавана да піва.**

— Доктар, у мяне грып, што вы мне параіце?
— Станьце ад мяне далей!

**Што за палітыка падвойных стандартаў? Калі ты маленькі — усе абураюцца, што ты не спіш, а бегаеш. А калі ты вырас — усе абураюцца, што ты спіш, а не бегаеш!**

У гарэме:
— Чаму да нас не прыходзіць наш гаспадар?
— У яго новае захапленне.
— А як яе завуць?
— Інтэрнэт.



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4423.
Нумар падпісаны ў 19.30 27 лістапада 2017 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12